# Смех з нагоды

**Марафон**

**Так, а нагода была, як кажуць, тое, што трэба — першага красавіка. І ў Мінску ладзіўся сапраўдны фестываль — Рэспубліканскае свята гумару "Беларусы смяюцца", арганізатарам якога выступіла Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Уся гэта дзея адбывалася ў Доме літаратара, уваход у які трэба было "заслужыць". Справа ў тым, што амаль адразу за ўваходнымі дзвярыма месціўся "прапускны пункт", а "пропуск" — штамп-пацалунак на руку — можна было атрымаць некалькімі спосабамі: расказаць анекдот, гумарную гісторыю альбо апусціць грошы ў імправізаваную скарбонку-слоік.**



У фае на другім паверсе таксама "віравала" жыццё. На сталах былі раскладзены нумары часопіса "Вожык", а над імі на сцяне знайшла прытулак выстаўка карыкатур аўтараў-мастакоў гэтага выдання. Выклікалі ўсмешку малюнкі Алега Гуцола, Аляксандра Каршакевіча, Паўла Шычко, Пятра Козіча, Андрэя Пучканёва, Анатоля Гармазы, Алега Папова, Сяргея Волкава. Ладзілася выстаўка-продаж кніг, дыскаў са старадаўняй музыкай, з казкамі і песнямі, а таксама дыскі з творамі М. Багдановіча, Янкі Купалы, І. Мележа, М. Ермаловіча, У. Караткевіча, Л. Геніюш, Н. Гілевіча, У. Някляева, Р. Барадуліна. Народ таньчыў пад вясёлую народную музыку. Ладзіліся разнастайныя конкурсы: валёнкам збівалі валёнак, кідалі бульбу ў чыгунок, віламі з завязанымі вачамі намацвалі чыгунок, пацвярджаючы званне спраўнай гаспадыні ці гаспадара...

У вялікай жа зале быў аншлаг, не выправілі сітуацыю і прынесеныя крэслы: месцаў усім жадаючым — публіка сабралася ўсіх узростаў, ад школьнікаў да дзядуль і бабулек — далучыцца да свята так і не хапіла, і запозненыя аматары гумару вымушаны былі падпіраць плячыма сцены ў праходах. Не вельмі добрай кпінай стала затрымка адкрыцця вечара амаль на паўгадзіны. Як потым гумарнуў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, гэта было зроблена наўмысна, бо ў Доме літаратара адключалі ацяпленне, і спатрэбілася якраз трыццаць хвілін, каб прысутныя нагрэлі сваімі целамі і дыханнем залу для выступоўцаў.

Распачаў вечарыну гурт народнага гумару і жартаў "Смехаўё" з вёскі Баянічы (дзе ладзілася свята гумару) Любанскага раёна. Адмыслова апранутыя мужчыны і мажныя кабеты запрасілі гледачоў "У Баянічы на гулянічы". Самадзейныя артысты адразу стварылі святочны настрой. Літаральна бесперапынна са сцэны гучалі жарты, песні, кпіны адно з аднаго, было і "эратычнае" распрананне і пераапрананне. Іх падхапілі прадстаўнікі іншых "сталіц" святаў гумару — вёсак Спорава і Аўцюкі. Жарты апошняй агучваў пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса "Вясёлка" Уладзімір Ліпскі. Дарэчы, Уладзімір Сцяпанавіч — аўтар пяці кніг пра Аўцюкі; з яго слоў, пра вясковыя досціпы можна выдаць яшчэ цэлы стос кніжак.

Прыйшліся даспадобы публіцы анекдоты, маналогі ды спевы заслужанага артыста Беларусі Уладзіміра Радзівілава.

Са сваімі пародыямі на вершы У. Марука, Л. Дранько-Майсюка, А. Усені выступілі Мікола Шабовіч і кампанія. Кампанія ж складалася з Анатоля Міхальчэнкі і Дзмітрыя Пятровіча, якія пародыі Шабовіча праспявалі пад гітару. Да іх са сваімі вершамі-пародыямі далучыліся гродненскія творцы Пётр Сямінскі і Фёдар Чычкан.

Аздобілі вечар гумару выступленні студэнтаў кафедры рэжысуры беларускіх абрадаў і свят БДУКіМ: гумарыстычная інтэрмедыя "Маня" (студэнты 114-ай групы), а таксама прадстаўнікі кафедры харэаграфіі з нумарам "Кармен", Марына Кавалёва з нумарам "Вось гэта так!"...

Не абышлося і без падарункаў: выкшталцоныя вядучыя за лепшую ўсмешку (як жартавалі, можна і без зубоў) прэзентавалі гледачоў кнігай У. Ліпскага "Чыстая брахня". А старшыня СПБ Мікалай Чаргінец узнагародзіў граматамі СПБ удзельнікаў мерапрыемства: калектывы СШ № 193, гімназіі № 21, Кацярыну Мінкіну, Аляксандра Сабалеўскага, Вольгу Кандратовіч, Дзмітрыя Пятровіча...

**Віктар КАВАЛЁЎ**





***На здымках: імгненні са свята гумару.***

*Фота Кастуся Дробава*

ПОЗИТОРИЙ БГУ